CENTRUM
WSPIERANIA
INICJATYW
MIĘDZYNARODOWYCH

Правілы адкрытага "Конкурсу на лепшы аналітычны тэкст", прызначанага для прадстаўнікоў сфер, фарміруючых грамадскую думку ў Беларусі.

§ 1

У конкурсе могуць прымаць удзел:

а) навукоўцы і спецыялісты ў галіне журналістыкі, паліталогіі, міжнародных адносін, эканомікі, гісторыі, сацыялогіі, якія супрацоўнічаюць (у тым ліку публікуючы свае тэксты) з навуковымі і аналітычнымі цэнтрамі ў Беларусі і ў замежжы.

б) журналісты, якія працуюць у газетах, на радыё і тэлебачанні, для інтэрнэт-парталаў, а таксама спецыялісты, якія супрацоўнічаюць з гэтымі відамі СМІ ў Беларусі і беларускімі СМІ, якія працуюць за мяжой.

§ 2

1. Умовай удзелу ў конкурсе з'яўляецца наяўнасць пацверджаных навуковых дасягненняў і у дасягненняў галіне журналістыкі, звесткі аб якіх падаюцца ўдзельнікамі ў анкеце.
2. Для прыняцця заяўкі на ўдзел у конкурсе неабходна выслаць арганізатарам асабістую анкету.

§ 3

Работы павінны адпавядаць наступным крытэрыям:

а. змест публікацый павінен адказваць мэтам конкурсу і адпавядаць выбранай тэматыцы;
б. форма работы – аналітычны тэкст;
в. аўтар можа выбраць адну ці некалькі тэм;
г. работы на конкурс могуць заяўляцца канкрэтнымі аўтарамі ці арганізацыямі (рэдакцыямі, навуковымі цэнтрамі і т.д.);
д. работы павінны быць напісаны на рускай ці польскай мове;
е. работы ацэніць конкурсная Камісія, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі навуковай сферы і сферы СМІ, а таксама прадстаўнікі арганізатара.

§ 4

Прызы:

1 x I месца – 1200 еўра
1 x II месца – 800 еўра
1 x III месца – 400 еўра

Усе лаўрэаты атрымаюць магчымасць прадставіць тэзісы сваіх тэкстаў падчас выступлення з рэфератам на міжнароднай канферэнцыі, арганізаванай ЦПМІ сумесна з Універсітэтам Адама Міцкевіча ў Познані, якая адбудзецца пасля ўрачыстага ўручэння прэмій. Тэрмін – чэрвень 2018 г.

§ 5

Прызы ўручаюцца лаўрэатам асабіста.

§ 6

Камісія пакідае за сабой права інакш размеркаваць прызы ў залежнасці ад якасці, колькасці і спецыфікі атрыманых работ, а таксама можа не прысудзіць якога-небудзь з прызавых месцаў.

§ 7

Работы належыць адпраўляць на электронны адрас: konkurscwim@wp.pl

§ 8

Патрабаванні да афармлення тэкстаў:

1. тэксты ў электронным выглядзе павінны быць выкананы з выкарыстаннем любога тэкставага рэдактару ў фарматах .doc, .docx, PDF. Тэксты належыць адпраўляць на электронны адрас: konkurscwim@wp.pl

2. аб’ём артыкула не павінен перавышаць 18.000 знакаў. Мінімальны аб’ём артыкула – 10.000 знакаў.

3. Тэхнічныя патрабаванні:

    - шрыфт: Times New Roman, памер шрыфта – 12 (у выпадку зносак унізе старонкі – 10);
    - міжрадковы інтэрвал – 1,5 (са зноскамі – 1);
    - палі: 2,5 см з усіх бакоў.

4. На першай страноцы ў левым верхнім куце належыць напісаць імя і прозвішча аўтара/аўтараў.

---

§ 9

Тэмы конкурсу:
Блок А. ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

1. Найбольш важныя выклікі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь;
2. Галоўныя выклікі палітыкі Рэспублікі Беларусь адносна Расійскай Федэрацыі;
3. Беларусь і Еўрапейскі Саюз: перспектывы супрацоўніцтва, сферы канфлікту.

Блок Б. ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД

1. Эфектыўнасць канстытуцыйных органаў улады РБ;
2. Перспектывы рэфармавання праваахоўных і адміністрацыйных органаў;
3. Сістэма абароны правоў чалавека ў РБ.

Блок В. ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖАВА

1. Давер грамадзянства да ўладаў і праваахоўных органаў – цяперашні стан і перспектывы;
2. Польская нацыянальная меншасць: становішча, месца і роля ў беларускім грамадстве;
3. Працэсы сацыяльна-эканамічнай дэферэнцыяцыі ў Беларусі – цяперашні стан і перспектывы.

Блок Г. БЯСПЕКА

1. Найбольш важныя выклікі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь;
2. Роля Беларусі ў сыстэме рэгіянальнай бяспекі;
3. Антыкрызіснае кіраванне – тэорыя і практыка.

Блок Д. ЭКАНОМІКА

1. Эканамічны крызіс ва ўспрыманні ўладаў і грамадства. Перспектывы пераадолення праблем;
2. Прамыя замежныя інвестыцыі ў Беларусі – цяперашні стан і перспектывы;
   Месца Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе – магчымасці і выклікі

§ 10

Каляндар:

20 ліпеня 2017 г. – абвяшчэнне конкурсу
20 ліпеня – 30 **сакавіка** 2018 гг. – прыём тэкстаў і ацэнка тэкстаў
16 красавіка  2018 г. – абвяшчэнне вынікаў
чэрвень 2018 г. – уручэнне прызоў